# З НОВЫМ ГОДАМ, СЯБРЫ!


# Гомельскі універсітэт



ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№ 35 (822) | Панядзелак, 30 снежня 1991 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 3 кап.


**ВОСЬ і заканчваецца ў нашым жыцці яшчэ адзін — 1991 год. У летапісу краіны ён стаў сапраўды гістарычным у самым шырокім сэнсе слова. Ужо няма раней непарушнага Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, сышла з палітычнай арэны КПСС, замест светлых дзён мы дачакаліся вельмі смутных.**

**І ўсё ж не будзем страчваць аптымізм, а з надзеяй глядзець на лепшую будучыню. Перацерпім глыбокі сацыяльна-эканамічны крызіс, непамерна высокія цэны на ўсе прадукты, прамысловыя тавары і аказваемыя паслугі (паверым, што гэта часовая з'ява), толькі б над намі заставалася мірнае неба, не ўшчымляліся чалавечыя правы і свабоды.**

**Па даўняй традыцыі сёння жадаем Вам, дарагія сябры, моцнага здароўя, веры ў свае сілы і магчымасці, асабістага шчасця!**

**З надыходзячым Новым, 1992 годам!**

**РЭКТАРАТ.**



«Ад сэрца да сэрца» — такую сімвалічную назву атрымала высакародная акцыя студэнтаў нашага універсітэта. Вось ужо на працягу некалькіх гадоў яны наладжваюць дабрачынную навагоднюю ёлку для дзяцей, з якімі лёс абышоўся несправядліва — сірот, інвалідаў, хворых. Для іх збіраюцца навагоднія падарункі, якія уручаюць рабятам Дзед Мароз і Снягурачка.

(Аб гэтым чытайце ў матэрыяле «Ад сэрца да сэрца», змешчаным на 2-й старонцы сённяшняга нумара нашай газеты).

## ЗАПРАШАЮЦЬ ДЗЕД МАРОЗ І СНЯГУРАЧКА

**дзяцей выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта на Навагодні ранішнік каля лясной прыгажуні-ёлкі, які адбудзецца 2 студзеня ў Палацы культуры ВА «Гомельпрамбуд».**

**Пачатак у 13.00**

**А навагоднія падарункі можна атрымаць у прафкоме (галоўны корпус, п. 1-22).**

*Прыемныя весткі*

## З ГАНАРОВЫМІ ЗВАННЯМІ

Дажываючы апошнія тыдні свайго існавання, Дзяржкамспорт краіны прысвоіў самыя ганаровыя спартыўныя званні «Заслужаны майстар спорту» двум гамяльчанам, двум чэмпіёнам свету па вольнай барацьбе — першакурсніку факультэта фізічнай культуры нашага універсітэта Вугару Аруджаву і студэнту-завочніку гэтага ж факультэта Сяргею Смалю.

А вось Дзяржкамспорт Рэспублікі Беларусь прысвоіў ганаровае званне «Заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь» ст. трэнеру зборнай каманды вобласці, дырэктару абласной ДЮСШ (якая размешчана на базе нашага універсітэта) па барацьбе Аляксандру Хатылёву.

**Аляксандр Хатылёў** вядомы ў недалёкім мінулым спартсмен, майстар спорту, неаднаразовы чэмпіён рэспублікі. Зараз ён перадае свае майстэрства не толькі юным спартсменам, але і дарослым. Зборная вобласці, якую ўзначальвае А. Хатылёў, у апошнія гады зрабіла значны крок наперад, да вяршынь майстэрства.

### УПЕРШЫНЮ ЧЭМПІЁНКА СВЕТУ

У Францыі завяршыўся чэмпіянат свету па самба сярод жанчын. Упершыню ў гісторыі спорту Гомельшчыны наша зямлячка Анжэла Патапава стала чэмпіёнкай свету. Анжэла — студэнтка-завочніца факультэта фізічнай культуры. Яе падрыхтаваў Уладзімір Драбкоў, які працуе трэнерам у ДЮСШ прафкома ВА «Карал».

Падведзены вынікі папулярнага конкурсу «Дзесяць лепшых спартсменаў Беларусі» па выніках 1991 спартыўнага года, які быў арганізаваны рэдакцыяй газеты «Физкультурник Белоруссии», Дзяржкамспортам і Асацыяцыяй спартыўнай прэсы Рэспублікі Беларусь.

Прыемна адзначыць, што спартсменам № 3 названа студэнтка нашага універсітэта, майстар спорту міжнароднага класа, трохразовая чэмпіёнка Еўропы-91 — Алена Рудкоўская. Восьмы радок заняў чэмпіён свету-91 па вольнай барацьбе Сяргей Смаль.

Лепшым трэнерам рэспублікі-91 названы трэнер каманды СКА Мінск па ручному мячу — Спартак Міpановіч. Нагадаю, што Спартак Міpановіч у 1963 годзе скончыў факультэт фізічнага выхавання (так ён раней называўся) Гомельскага педінстытута імя В. П. Чкалава. Вось так!

**В. МАРЧАНКА.**

Иван ХАРЛАМОВ

## Новый год

Есть миг, когда,
Скрываясь в звездной темени,
Своим секундам завершая счет,
Декабрь святую эстафету
времени,
Как другу, январю передает.
И в этот миг невидимой их
встречи
С надеждами сидим мы
за столом...
Звенят бокалы. Льются
тосты-речи.
И все ж, и все ж гадаем
мы о том,
Какая в сатанинской злобе
сила
Бедой и смутой по стране
прошлась,
Могучую державу сокрушила,
Разрушила и праведность,
и власть?
Мы заклеймили
Сталина-тирана...
Теперь же, Новый год,
ты обнажи
И тайны всенародного обмана,
И маскировку рыночную лжи.
Будь милостив ты к людям,
что в бесчестье
Униженно стоят в очередях...
О, Родина, давай искать
мы вместе
Из беспросвета к свету
трудный шлях!

# ПЛАНЕТА ВАКОЛ ЁЛКІ

Калі ўспамінаюць гісторыю зімовага навагоддзя, звычайна абмяжоўваюцца спасылкай на загад Пятра І 1699 года. Пры гэтым растлумачваюць, што мэтай пятроўскай рэформы было зрабіць падобным расійскі каляндар на календары заходнееўрапейскіх краін. Праз «прарубленае акно» Расія ўваходзіла ў «еўрапейскі дом»: для зручнасці зносін неабходна была адзіная сістэма гадавога часалічэння.

Аднак пытанне, дзе выток заходнееўрапейскага звычая святкаваць Новы год зімой, застаецца без адказу.

Такім чынам, традыцыя сустракаць Новы год зімой была ўласціва старажытнаму насельніцтву Еўропы. Яе пераанялі сучасныя еўрапейцы, перш за ўсё германаязычныя народы і славяне. Прыхільнасць да афіцыйнага зімовага навагоддзя ідзе ад Старажытнага Рыма: у сярэдзіне зімы атрымлівалі пасады зноў абраныя консулы, да гэтага часу ў Рым сцякаліся падаткавыя паступленні з усёй імперыі. Спалучэнне гэтых дзвюх традыцый рабіла зручным і зразумелым студзеньскі Новы год у новых еўрапейскіх дзяржавах, у тым ліку і ў Расіі.

У наш час жыхары розных краін сустракаюць Новы год па-свойму. У Балгарыі, напрыклад, з нецярпеннем чакаюць апошняга ўдару гадзінніка, калі ў дамах на некалькі мінут абавязкова тушаць святло. Урачыста разразаюць пірагі з запечанымі ў іх сувенірамі.

Судны, якія стаяць у порце, гудкамі абвяшчаюць аб надыходзе Новага года ў Галандыі.

У Японіі роўна апоўначы раздаецца 108 удараў звона. У гэтыя мінуты па японскіх народных прыкметах чалавек пераступае нейкі парог, за якім яго чакае новы лёс, калі ўсё жыццё можа пайсці інакш, калі можа прыйсці шчасце.

Паспрабуйце ў пераднавагоднія дні купіць у Венгрыі звычайныя дзіцячыя свістулькі, ражкі, дудачкі, трубы — набегаецеся! Усё даўно раскуплена. У народным павер'і гаворыцца, што пранізлівы гук гэтых немудрагелістых музычных інструментаў адганяе ад жылля злых духаў, заклікае ў кожны дом радасць і дабрабыт.

У Германіі людзі самага рознага ўзросту, як толькі пачынаюць гадзіннікі адбіваць поўнач, узбіраюцца на стулі, сталы, крэслы і з апошнім, дванаццатым ударам дружна, з радаснымі прывітаннямі «ускокваюць» у Новы год.

